УДК 398.34:303.425.5

***Ала Мікалаеўна Нароўская***
*канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыка-культурнай спадчыны*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*
***Ala Narouskaya***
*Candidate of Historical Sciences, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage*
*of Belarusian State University of Culture and Arts*
e-mail: anarovskaya@gmail.com

# КРЫНІЦЫ І МЕТАДЫ ЭТНАГРАФІЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ ТРАДЫЦЫЙНАГА ЖЫЛЛЯ БЕЛАРУСАЎ

*Разглядаюцца пытанні класіфікацыі і інтэрпрэтацыі гістарычных крыніц даследавання традыцыйнага жылля беларусаў. Даецца сістэматызацыя этнаграфічных крыніц па праблеме выяўлення семіятычных асаблівасцей традыцыйнага жылля беларусаў. Разглядаюцца метады, якія прымяняюцца падчас правядзення этнаграфічных палявых экспедыцый.*

***Ключавыя словы:*** *традыцыйнае жыллё, этнаграфічныя экспедыцыі, семіётыка, крыніцы, метады.*

## *Sources and Methods of Ethnographic Research of Traditional Dwelling of Belarusians*

*The article discusses issues of classification and interpretation of historical sources. A systematization of ethnographic sources on the problem of identifying the semiotic features of the traditional dwelling of Belarusians is given. The methods that are used during ethnographic field expeditions are considered.*

***Key words:*** *traditional dwelling, ethnographic expeditions, semiotics, sources, methods.*

### Уводзіны

Найбольш каштоўны матэрыял па вывучэнні традыцыйнага жылля быў атрыманы падчас этнаграфічных экспедыцый. Вядучым метадам збору этнаграфічных даных да XIX ст. быў метад непасрэднага назірання. У XIX ст. палявыя этнаграфічныя назіранні асэнсоўваюцца, з’яўляюцца навуковыя праграмы для збору звестак па культуры і побыце этнасаў. Так, у «Гродзенскіх губернскіх ведамасцях» (1866) была надрукавана праграма Г. Кулжынскага па збору этнаграфічных звестак і фальклору [1]. У архіве Расійскага этнаграфічнага музея (РЭМ) захоўваецца «Кароткая праграма для збірання этнаграфічных прадметаў у Беларусі», складзеная А. К. Сержпутоўскім [2, арк. 2]. У гэтай праграме даюцца рэкамендацыі па даследаванні беларускага традыцыйнага жылля. Даследчык пералічвае розныя назвы паселішчаў, відаў жылля, якім у час этнаграфічных экспедыцый трэба было надаць увагу: «Селішчы: мястэчка, сяло, вёска, выселак, пасёлак, хутар і інш. Планы вуліц, дарог і размяшчэнне двароў, а таксама гумнаў, стагоў хлеба, сена і саломы. Ізба (хата), святліца, курнік, клець, варыўня, свіран, гумно, хлеў, свінух, загон, паветка, шопа, стадола, курань, склеп… ба-ні (лазні)… веснічкі, завалеі і інш.» [2, арк. 6].

У Праграме даюцца рэкамендацыі А. К. Сержпутоўскага па выяўленні асаблівасцей беларускага жылля, па «магчымасці рабіць планы, чарцяжы, мадэлі пабудоў і іншых збудаванняў і даваць самае падрабязнае апісанне з усімі, якія адносяцца сюды, павер’ямі выбару месца, спосабу і тэхнікі ўзвядзення той ці іншай пабудовы» [2, арк. 6].

Палявыя назіранні паступова становяцца метадам назапашвання этнаграфічных крыніц са сваёй методыкай атрымання інфармацыі. Ператварэнне этнаграфіі ў гістарычную навуку, якая не толькі вывучае традыцыйную культуру народа, але і даследуе этнагенез, этнічныя працэсы, асаблівасці культуры і побыту этнасаў, значна пашырыла базу крыніц этнографа. Улічваючы прыналежнасць этнаграфіі да гістарычных навук, этнаграфічнай крыніцай могуць быць як палявыя (экспедыцыйныя) матэрыялы, так і факты, сабраныя сумежнымі гуманітарнымі і грамадскімі навукамі.

### Асноўная частка

***Класіфікацыя гістарычных крыніц.*** Даследчыкі распрацавалі некалькі класіфікацый гістарычных крыніц. Паводле Л. Н. Пушкарова, у аснове дзялення крыніц на тыпы ляжыць спосаб фіксацыі заключанай у іх інфармацыі. Даследчык вылучаў наступныя

тыпы гістарычных крыніц: пісьмовыя, рэчавыя, вусныя (фальклор), этнаграфічныя, лінгвістычныя, кінафотадакументы, фонадакументы [3].

Можна таксама назваць іншых крыніцазнаўцаў, якія займаліся пытаннямі класіфікацыі і інтэрпрэтацыі гістарычных крыніц: О. М. Мядушэўская, С. О. Шмідт, І. Д. Кавальчанка. Такім чынам, этнаграфічныя палявыя матэрыялы можна аднесці да разнавіднасці гістарычных крыніц; у той жа час паміж гістарычнымі і этнаграфічнымі крыніцамі існуе значная розніца. Гістарычныя крыніцы – гэта дакументы, якія застаюцца ў выніку функцыянавання грамадства або дзяржавы. Асноўнымі фактычнымі данымі для этнаграфіі з'яўляюцца палявыя матэрыялы. Мэта этнаграфічных экспедыцый – вывучэнне этнічных культур і, адпаведна, фіксацыя даследаванняў у палявых матэрыялах. Такім чынам, этнаграфічныя крыніцы свядома ствараюцца этнографамі ў працэсе палявой працы.

***Сістэматызацыя этнаграфічных крыніц.*** Этнаграфічныя палявыя крыніцы падзяляюцца на наступныя віды: назіранні, анкетаванне ці проста запісы этнографаў, інтэрв'ю, аўдыё- і відэазапісы, фотаздымкі, планы і чарцяжы, рэчавая калекцыя. Усе этнаграфічныя матэрыялы суправаджаюцца тэкставымі запісамі і каментарамі. Пісьмовыя этнаграфічныя палявыя крыніцы апрацоўваюцца і захоўваюцца ў архівах.

Цікавымі для даследавання семіятычных асаблівасцей традыцыйнага жылля беларусаў з'яўляюцца палявыя этнаграфічныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў архіве Расійскага этнаграфічнага музея. Так, у справаздачы этнограф А. К. Сержпутоўскі прыводзіць звесткі, якія былі звязаны з выбарам шчаслівага месца для будаўніцтва жылля і запісаны даследчыкам са слоў жыхароў Мазырскага і Слуцкага паветаў Мінскай губерні [4, арк. 220].

Значнымі для даследавання з'яўляюцца этнаграфічныя запісы В. К. Косткі, які прыводзіць найбольш зручны час для пачатку будаўніцтва жылля. Інфармацыю даследчык запісаў падчас этнаграфічнай экспедыцыі ў Ігуменскі павет Мінскай губерні [5, арк. 15]. У архіўных матэрыялах РЭМ зафіксавана таксама інфармацыя пра будаўнічыя рытуалы, звязаныя з ахвярапрынашэннямі свойскіх жывёл [4, арк. 221].

У рукапісах А. К. Сержпутоўскага, Е. Р. Раманава і В. К. Косткі ўтрымліваюцца звесткі пра планіроўку і тыпы традыцыйнага жылля, абрады і ўяўленні беларусаў, звязаныя з жыллём. Так, у справаздачы А. К. Сержпутоўскага аб камандзіроўцы ў Мінскую губерню (1923) адзначаецца, што было сабрана «больш за 600 павер'яў, прымет і забабонаў» [6, арк. 7адв.]. Інфармацыю аб семіятычнай мадэлі паселішчаў і яе маркіраваных межах (прыдарожнымі крыжамі, камянямі альбо агароджаю) можна знайсці ў рукапісах В. К. Косткі [5, арк. 10].

Прадметы побыту ў традыцыйным жылллі выконвалі не толькі практычную функцыю, але і сімвалічную, што было зафіксавана аўтарам у этнаграфічных экспедыцыях Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Так, пячное начынне разглядалася беларусамі як магічны сродак у барацьбе з «нябеснай вадой» [7]. Аналагічная інфармацыя была зафіксавана ў рукапісным архіве РЭМ [4, арк. 195].

Цікавыя матэрыялы па будаўнічай тэхніцы [8, арк. 38–41], асаблівасцях архітэктурнага дэкору жылля [9, арк. 2, 29], інтэр'еру, мэблі жылля [10, арк. 45], прадметах побыту былі выяўлены ў архіве Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. У фондах музеяў захоўваецца шматлікая група такой важнай этнаграфічнай крыніцы, як фотаздымкі. Збор фатаграфій Расійскага этнаграфічнага музея ахоплівае перыяд з сярэдзіны 40-х гг. XIX ст. да пачатку XXI ст. У цяперашні час фатаграфічны фонд РЭМ налічвае больш за 200 тыс. адзінак захоўвання (негатывы і пазітывы) [11, с. 500]. Сюжэты гэтых фотаздымкаў адлюстроўваюць культуру розных этнасаў. Большасць – гэта чорна-белыя здымкі, зробленыя супрацоўнікамі і карэспандэнтамі музея ў перыяд інтэнсіўнага камплектавання музейнага збору ў першай палове XX ст. У першай трэці XX ст. пры Этнаграфічным аддзеле Рускага музея Імператара Аляксандра III (так называўся музей у той час), была арганізавана фоталабараторыя, якая выдавала фотапараты супрацоўнікам, якія накіроўваліся ў камандзіроўкі.

Як паказаў аналіз архіўных матэрыялаў РЭМ, этнограф А. К. Сержпутоўскі ў сваёй справаздачы па Мінскай і Магілёўскай губернях (1924) прыводзіць спіс фатаграфій [6, арк. 10]. Даследчык дае поўны

спіс фатаграфій, выкананых ім па даручэнні ЭА ГРМ у Слуцкім павеце Мінскай губерні (1925) [6, арк. 12–12адв.]. Сярод фатаграфій – хаты, гумно, істопкі, вяндлярні, разнастайныя агароджы жылля і інш. Да справаздачы А. К. Сержпутоўскага аб паездцы ў Магілёўскую губерню таксама прыкладаецца спіс фатаграфій, на якіх шмат прадметаў побыту і посуду [12, арк. 40].

Вялікую цікавасць уяўляюць фатаграфіі В. К. Косткі, зробленыя ім у Магілёўскай губерні (Гомельскі, Горацкі, Магілёўскі, Мсціслаўскі і Рагачоўскі паветы). У 1905 г. В. К. Костка даследаваў Ігуменскі і Слуцкі паветы Мінскай губерні. Падчас паездкі ён сабраў мноства этнаграфічных прадметаў, даследаваў традыцыйнае жылле і яго ўнутраную планіроўку [5, арк. 1–15]. Асаблівую каштоўнасць уяўляюць фатаграфіі, зробленыя В. К. Косткам: на іх адлюстраваны разнастайныя віды жылых і гаспадарчых пабудоў, двароў, агульных планаў і ландшафтаў паселішчаў Мінскай губерні.

У справаздачах рукапіснага архіва Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ўтрымоўваюцца сотні фатаграфій дамоў, гаспадарчых пабудоў, малых архітэктурных форм, якія былі зроблены падчас экспедыцый з 1977 г. да цяперашняга часу.

Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей – архіў ІМЭФ НАН Беларусі) змяшчае ўнікальныя візуальныя сведчанні, якія захавалі ландшафт, паселішчы, жыллё, хатнія заняткі і рамёствы. Асабліва каштоўнымі для даследавання з'яўляюцца фатаграфіі канца 1940-х – 1950-х гг.: фатаграфіі традыцыйнага жылля, вулічных планіровак М. Я. Грынблата [13], Л. А. Малчанавай [14] і інш. У архіве ІМЭФ НАН Беларусі захоўваюцца таксама копіі фотаздымкаў з Рукапіснага аддзела Віленскага ўніверсітэта [15].

Для этнаграфіі важнымі з'яўляюцца такія гістарычныя крыніцы, як вопісы і інвентары маёнткаў [16], якія знаходзяцца ў Актах, выдадзеных Віленскай археаграфічнай камісіяй. У гэтых дакументах шмат каштоўнай інфармацыі пра планіроўку традыцыйнага жылля, прадметы інтэр'еру і мэблі. Каштоўнай інфармацыяй валодаюць, графічныя і выяўленчыя крыніцы, якія дазваляюць этнографам уявіць сабе не толькі факт існавання тых ці іншых з'яў, але і тое, як выглядала традыцыйнае жыллё і гаспадарчыя пабудовы, унутраная планіроўка жылля, мэбля і інш.

Адмысловая катэгорыя этнаграфічных крыніц – музейныя зборы, у якіх прадстаўлены прадметы побыту і культуры беларусаў або асобных этнічных груп, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі.

Так, у справаздачы пра этнаграфічную экспедыцыю ў Пінскі павет Мінскай губерні (1907) А. К. Сержпутоўскі дае спіс прадметаў, якія ён прывез і перадаў Этнаграфічнаму аддзелу Рускага музея Імператара Аляксандра III. Сярод музейных прадметаў – дзіцячыя хадуны, глякі, збаны, коўшыкі і інш. [2, арк. 24–27]. У справаздачы пра экспедыцыю ў Мазырскі павет Мінскай губерні А. К. Сержпутоўскі дае спіс больш за 220 этнаграфічных прадметаў, якія ён перадаў у музей. Сярод музейных прадметаў – асвяшчальныя прыстасаванні («дзядок», «свяцец»), куфры («кублы»), разнастайны гліняны посуд («банічка», «міска»), драўляны посуд («карэц», «ліпаўка», «берасцянка») і інш. [12, арк. 1–6].

У архіве РЭМ таксама ёсць дакументы па заказах і вырабе ў мясцовых беларускіх майстроў мадэляў традыцыйнага жылля і гаспадарчых пабудоў. Так, знойдзена заява ў Савет Этнаграфічнага аддзела Рускага музея Імператара Аляксандра III за подпісам В. К. Косткі. У заяве адзначаецца, што падчас камандзіроўкі ў Мінскую губерню ў 1905 г. была замоўлена мадэль сялянскага дома ў маштабе 1 : 10 натуральнай велічыні [17, арк. 39]. Беларускі этнограф Е. Р. Раманаў, які супрацоўнічаў з Этнаграфічным аддзелам Рускага музея з 1902 па 1910 г., таксама перадаў музею серыю мадэляў жылля, гаспадарчых і вытворчых будынкаў. Мадэлі не захаваліся, але іх падрабязнае апісанне ўяўляе пэўную навуковую каштоўнасць. Так, у справе 547 адзначаецца, што Е. Р. Раманаў у 1903 г. перадаў мадэлі хаты, свірана, хлява, гумна, «пуні», лазні і млына. Аўтар дае падрабязнае апісанне сялянскага двара Сенненскага павета Магілёўскай губерні [18, арк. 1]. У справе 676 адзначаецца, што Е. Р. Раманаў набыў у 1906 г. за сродкі Этнаграфічнага аддзела мадэль сялянскага двара з вёскі Кішкі Сененскага павета Магілёўскай губерні.

Найбольш значнымі музейнымі этнаграфічнымі калекцыямі, звязанымі з традыцыйным жыллем, валодаюць Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Музей старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі і інш.

Як паказаў аналіз справаздач навуковых супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, даецца апісанне толькі найбольш атрактыўных этнаграфічных прадметаў, а таксама тых, якія не былі набыты ў час экпедыцый. Спісы музейных прадметаў, якія былі набыты ў этнаграфічных экспедыцыях, у справаздачах не прыводзяцца.

Важнай этнаграфічнай крыніцай з’яўляюцца матэрыялы этнографаў другой паловы ХІХ – пачатку ХХ ст. Гэты перыяд характарызуецца вялікай колькасцю палявых этнаграфічных даследаванняў, што прывяло да назапашвання і ўвядзення ў навуковы зварот значнага аб’ёму наратыўнага этнаграфічнага матэрыялу. На выніках экспедыцый грунтуюцца фундаментальныя працы этнолагаў ХІХ – пачатку ХХ ст. А. Е. Багдановіча, М. Я. Нікіфароўскага, Е. Р. Раманава, І. А. Сербава, А. К. Сержпутоўскага, П. В. Шэйна і інш.

Традыцыйнае жыллё беларусаў падрабязна разглядаецца ў працах П. В. Шэйна. Ён выкарыстоўваў праграмы па зборы фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу. Метадалагічны ўзровень праграмы быў даволі высокі (з абавязковай пашпартызацыяй матэрыялу). Дзякуючы праграме П. В. Шэйн атрымаў разгалінаваную сетку карэспандэнтаў па ўсёй Беларусі. Звесткі, дасланыя карэспандэнтамі, ён апрацаваў і выдаў у шматтомным зборніку.

Працы М. Я. Нікіфароўскага прысвечаны даследаванню матэрыяльнай і духоўнай культуры сялян Віцебскай губерні. Ён разглядаў ідэаграмы і індыкатары, якія прымяняліся ў будаўнічай абраднасці, удзяляў ўвагу прынцыпам мадэлявання жыцця сям’і на канкрэтным месцы.

Значнае месца традыцыйнае жыллё займае ў выпуску VIII «Беларускага зборніка» Е. Р. Раманава. Ён прыводзіць звесткі аб планіроўцы жылля, асаблівасцях інтэр’ера сялянскай хаты, дае лакальныя назвы яго асобных элементаў.

Каштоўны ўклад у вывучэнне архітэктурных асаблівасцей жылля беларусаў зрабіў вядомы этнограф І. А. Сербаў. Унікальныя фотаздымкі І. А. Сербава падчас яго паездак па Беларусі ў 1911 і 1912 гг. знаходзяцца ў аддзеле рукапісаў біблітэятэкі Вільнюскага ўніверсітэта.

Цікавыя матэрыялы па традыцыйнаму жыллю Магілёўскай губерні можна знайсці ў А. С. Дэмбавецкага, Ю. Ф. Крачкоўскага, Гродзенскай губерні – у П. Бабpоўскага.

Багаты фактычны матэрыял па даследаванні традыцыйнага беларускага жылля змяшчаецца ў працы А. М. Харузіна. Ён разглядаў ўнутраную планіроўку традыцыйнага жылля, прыводзіў чарцяжы і схемы жылля. Але А. М. Харузін даследаваў толькі паветы Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў. Матэрыялы пра жыллё іншых рэгіёнаў Беларусі даюцца адрывіста.

Важнай крыніцай пры рэканструкцыі традыцыйнага жылля з’яўляюцца археалагічныя крыніцы. Вытокі развіцця жылля беларусаў, арганізацыя ўнутранай планіроўкі старажытнага жылля разглядаецца ў работах археолагаў Л. Д. Побаля, П. Ф. Лысенкі, Э. М. Загарульскага, Г. В. Штыхава і інш.

У якасці гістарычных крыніц, як правіла, выступаюць першакрыніцы, на аснове якіх стварацюцца другасныя крыніцы. Энцыклапедыі, слоўнікі – гэта абагульненыя звесткі з першасных крыніц, але тлумачальныя, этымалагічныя, міфалагічныя, фальклорныя, этнаграфічныя, лінгвістычныя, фразеялагічныя слоўнікі і энцыклапедыі маюць вялікае значэнне для атрымання інфармацыі па тэме даследавання.

**Заключэнне**

Такім чынам, у фармаце дадзенага артыкула даследаванне не можа ахапіць і ахарактарызаваць усе крыніцы, выкарыстаныя аўтарам. Шырока ўжываюцца пры вывучэнні жылля лінгвістычныя, фальклорныя, археалагічныя крыніцы. Перыяд ХІХ – пачатку ХХ ст. характарызуецца шырокім і сістэмным характарам палявых этнаграфічных даследаванняў, што прывяло да назапашвання вялікага аб’ёму этнаграфічнага матэрыялу. Асноўным быў эмпірычны метад вывучэння традыцыйнага жылля, дзякуючы якому былі праведзены грунтоўныя рэгіянальныя даследаванні. Але яны насілі наратыўны характар, а ўзровень тэарэтычнага

асэнсавання абмяжоўваўся нязначнымі аўтарскімі каментарыямі.

Пры даследаванні традыцыйнага жылля выкарыстоўваюцца самыя разнастайныя метады: метад назірання, заснаваны на непасрэдным кантакце даследчыка; метад інтэрв'ю, які прадугледжвае збор інфармацыі з дапамогай пытанняў. Апытанне – метад працы, у аснове якога ляжыць дыялог паміж этнографам і інфарматарам.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Кулжинский, Г. Об этнографических сведениях касательно Западной России / Г. Кулжинский // Гродн. губерн. вед. – 1866. – № 41; 1867. – № 21.
2. Архіў Расійскага этнаграфічнага музея (АРЭМ). – Ф. 1. Оп. 2. Спр. 573.
3. Пушкарев, Л. Н. Классификация русских письменных источников по отечественной истории / Л. Н. Пушкарев. – М. : Наука, 1975. – 282 с.
4. АРЭМ. – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 574.
5. АРЭМ. – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 352.
6. АРЭМ. – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 583.
7. Матэрыялы экспедыцыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (БДМНАП) у Нараўлянскі р-н Гомельскай вобл. у 1981 г. // Асабісты архіў аўтара.
8. Архіў БДМНАП. – Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па БССР (14.01–27.05 1978). – Справаздача аб камандзіроўцы ў Слуцкі раён 22.03–24.03.1978.
9. Архіў БДМНАП. – Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па БССР (22.01–03.02. 1979). – Этнаграфічная справаздача аб камандзіроўцы ў Гомельскі раён Гомельскай вобл. (22–27.01. 1979 г.).
10. Архіў БДМНАП. – Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па БССР (31.03–28.04.1979). – Справаздача аб камандзіроўцы ў Брэсцкую вобласць Пінскі раён. Рэгіён «Заходняе Палессе» (25.04- 28.04.1979 г.).
11. Гавришина, В. В. В стиле In-cognitus: этнограф в объективе своей фотокамеры / В. В. Гавришина, А. А. Михайлова // Зб. дакл. і тэз. VII Міжнар. навук.-практ. канф. «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў», Мінск, 24–25 ліст. 2016 г. : у 2 т. / гал. рэд. А. І. Лакотка ; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2017. – Т. 1. – 504 с.
12. АРЭМ. – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 578.
13. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору имя К. Крапівы (далей – Архіў ІМЭФ). – Фотатэка. – Фота № 39, 223, 226. М. Я. Грынблата 1949 г. Вулічная планіроўка, в. Ляскавічы к-с імя БВО Любанскага р-на.
14. Архіў ІМЭФ. – Фотатэка. – Фота № 241 Малчанавай Л. А. 1955 г. Вулічная планіроўка в. Бярэзіна Дземяхоўскага с/с Руднянскага раёна Смаленскай вобл.
15. Архіў ІМЭФ. Рукапісны аддз. Віленскага ўніверсітэта. Фота вулічнай планіроўкі № 65 в. Язвін Бабруйскага пав. ; Фота № 66. в. Крынка Бабруйскага пав. ; Фота № 71 в. Прудок Рэчыцкага пав.
16. Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею. – Вильна, 1887. – Т. XIV : Инвентари имений XVI столетия. – 655 с.
17. АРЭМ. – Ф.1. Воп. 2. Спр. 351.
18. АРЭМ. – Ф. 2. Воп. 2. Спр. 547.


## REFERENCES


1. Kulzhinskij, G. Ob etnografichieskikh sviedienijakh kasatiel'no Zapadnoj Rossii / G. Kulzhinskij // Grodn. gubiern. vied. – 1866. – № 41; 1867. – № 21.
2. Arhiu Rasijskaha etnagrafichnaha muzieja (AREM). – F. 1. Vop. 2. Spr. 573.
3. Pushkariov, L. N. Klassifikacija russkikh pis'miennykh istochnikov po otiechiestviennoj istorii / L. N. Pushkariov. – M. : Nauka, 1975. – 282 s.
4. AREM. – F. 1. Vop. 2. Spr. 574.
5. AREM. – F. 1. Vop. 2. Spr. 352.

6. AREM. – F. 1. Vop. 2. Spr. 583.
7. Materyjaly ekspiedycyi (BDMNAP) u Naraulianski r-n Homiel'skaj vobl. u 1981 h. // Asabisty arhiu autara.
8. BDMNAP. Spravazdachy ab navukovykh kamandziroukakh pa BSSR (14.01–27.05 1978). – Spravazdacha ab kamandziroucy u Slucki rajon 22.03–24.03.1978.
9. Arkhiu BDMNAP. Spravazdachy ab navukovykh kamandziroukakh pa BSSR (22.01–03.02. 1979). Etnagrafichnaja spravazdacha ab kamandziroucy u Homiel'ski rajon Homiel'skaj vobl. (22–27.01 1979 h.).
10. Arkhiu BDMNAP. Spravazdachy ab navukovykh kamandziroukakh pa BSSR (31.03–28.04.1979). Spravazdacha ab kamandziroucy u Bresckuju voblasc' Pinski rajon. Rehijon «Zakhodniaje Paliessie» (25.04–28.04.1979 h.).
11. Gavrishina, V. V. V stilie In-cognitus: etnograf v objektivie svojej fotokamiery / V. V. Gavrishina, A. A. Mikhajlova // Zb. dakl. i tez. VII Mizhnar. navuk.-prakt. kanf. «Tradycyi i suchasny stan kul'tury i mastactvaг», Minsk, 24–25 list. 2016 h. : u 2 t. / hal. red. A. I. Lakotka ; Centr dasliedavanniau bielaruskaj kul'tury, movy i litaratury NAN Bielarusi. – Minsk : Prava i ekanomika, 2017. – T. 1. – 504 s.
12. AREM. – F. 1. Vop. 2. Spr. 578.
13. Arkhiu Instytuta mastactvaznaustva, etnagrafii i fal'kloru imia K. Krapivy (Arhiu IMEF). – Fotateka. – Fota №39, 223, 226. M. Ya. Grynblata 1949 h. Vulichnaja planirouka, v. Liaskavichy k-s imia BVO Liubanskaha r-na.
14. Arkhiu IMEF. – Fotateka. – Fota № 241 Malchanavaj L. A. 1955 g. Vulichnaja planirouka v. Biarezina Dziemiakhouskaha s/s Rudnianskaha rajona Smalienskaj vobl.
15. Arkhiu IMEF. Rukapisny addz. Vilienskaha univiersiteta. Fota vulichnaj planirouki № 65 v. Jazvin Babrujskaha pav. ; Fota № 66 . v. Krynka Babrujskaha pav. ; Fota № 71 v. Prudok Rechyckaha pav.
16. Akty, izdavajemyje Vilienskoju arkhieografichieskoju komissijeju. – Vil'na, 1887. – T. XIV : Invientari imienij XVI stolietija. – 655 s.
17. AREM. – F. 1. Vop. 2. Spr. 351.
18. AREM. – F. 2. Vop. 2. Spr. 547.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 13.06.2024*